*Пётр Русаў*

# Памеры ацяпляльных печаў Позняга Сярэднявечча па выніках даследаванняў беларускіх вучоных (праблемы рэканструкцыі)

У сувязі з правядзеннем маштабных работ па рэстаўрацыі Замкавага комплексу "Мір" настала неабходнасць шырокага адлюстравання матэрыялаў археалагічных даследаванняў гэтага помніка. Адна з актуальнейшых задач – узнаўленне інтэр'ераў памяшканняў замка. У Паўночным корпусе на другім ярусе былі ўзведзены тры аднолькавыя па памерах печы. Да прыкладу, вышыня ўсёй печы больш за 3,8 м. Ніжні ярус прамакутны ў плане памерамі 1,75 х 1,45 м і вышынёй (без падмурка) 1,49 м. Верхні ярус круглы ў плане дыяметрам 1,2 м. Дадзенае трактаванне аб'ёмаў ацяпляльных печаў XVI–XVIII стст. выклікала крытычныя заўвагі з боку гісторыкаў, мастацвазнаўцаў і археолагаў навукова-творчай групы па музеефікацыі Замкавага комплексу "Мір". Мы таксама лічым, што рэканструкцыя печаў такіх вялікіх памераў не адпавядае памерам печаў выяўленым пад час археалагічных раскопак і вырашылі неабходным звярнуцца да рэканструкцый ацяпляльных печаў адзначанага часу, ужо зробленых на выснове археалагічных даследаванняў.

У 1992 г. у Полацку, у раскопе (вул. Леніна, 35) выяўлена драўляная пабудова памерам 4 х 4,7 м. Унутры яе выяўлены апорныя драўляныя слупкі печы, якія ўтваралі апечак у плане памерамі 1 х 1 м. Печ стаяла на адлегласці 0,5 м ад сцяны пасярэдзіне яе даўжыні. Абліцавана геральдычнай кафляй першай трэці XVII ст. Цаглінкамі-пліткамі таўшчынёй да 5 см выкладзена падлога ля топачнай адтуліны. Драўляная падлога ў доме пакладзена на гліняную аснову [1, с. 47].

У культурным пласце ў пабудове сярэдзіны XVII ст. (вул. К.Маркса 1 каля дзіцячай мастацкай школы) з драўлянай падлогай знойдзены прамакутны ў плане падмурак печы памерамі 1,4 х 1,1 м, у кладцы якога ўжываліся камяні [1, с. 48–49]. З двух супрацьлеглых бакоў ён абшыты дошкамі. Па меркаванню даследчыцы Н.І. Здановіч, печ "блізкая па канструкцыі адной з вавельскіх". 1/3 частка фрагментаў кафляных пласцін – тэракотавая, сярод якіх геральдычная, частка пакрыта палівай гарчычнага колеру і большая палівай зялёнага. Яе ніжні ярус з трох радкоў кафлі, верхні – з пяці (мал. 1, 1).




*Мал. 1. Варыянты рэканструкцыі Полацкіх печаў (па Н.І. Здановіч).*
*1,2 - печы сярэдзіны XVII ст. з пабудоў на вуліцы К. Маркса, 1;*
*3 - печ канца XVII - пачатку XVIII ст. па вуліцы Леніна, 35*

У раскопе 1990 г. па вул. К. Маркса 1, дзе выяўлены рэшткі цаглянага падмурка дома, знаходзіўся цагляны падмурак ацяпляльнай печы сярэдзіны XVII ст. памерам 1,85 х 1 м, якая атаплівала два сумежныя памяшканні. Яна рэканструіруецца

як печ з камінам [1, с. 51]. Топачная адтуліна знаходзілася ў іншым памяшканні. Падлога перад ёй выкладзена керамічнай пліткай памерамі 30 х 30 см і таўшчынёй да 5 см. Сценка печы з гэтага боку выкладзена з тэракотавай геральдычнай кафлі, астатнія сцены з зялёнапаліванай. Ніжні яе ярус набраны з трох радкоў кафлі, а верхні з васьмі. Агульная вышыня печы не перавышае 2,2 м (мал. 1, 2). Знойдзены геральдычныя кафліны, што прызначаліся ў якасці «цеплавых вокнаў», праз якія прачышчаліся ўнутраныя люфты печы.

Графічна рэканструявана печ к. XVII – пач. XVIII ст., якая мела памеры ў плане 1,1 х 1,1 м [1, с. 53]. Аздоблена цёмназялёнапапліванай сцянной і гзымсавай кафляй з выявай вянка, паясковай рэльефнай паліхромнай з сінімі парасткамі на белым фоне, цёмна-зялёнымі гарадкамі і белымі эмалевымі балясінамі. У цэнтры адной з граней была ўстаўлена геральдычная кафля (мал. 1, 3).

Падагульняючы свае даследаванні, Н.І. Здановіч лічыць найбольш аптымальным варыянтам вышыню печаў у 2,2 м, што дазваляе іх размячшэнню ў гарадской сядзібе, а таксама ўпрыгожванні інтэр'ера мураваных палацаў [1, с. 50]. Яна абапіраецца на аналагі з Германіі і Польшчы і заўважае, што ніжні ярус быў заўсёды меншы ў вышыню за верхні. Таксама прыходзіць да высновы, што парадныя печы ў гасціных і святліцах з к. XVI ст. мелі памеры ў плане каля 1 х 1 м.

Тэндэнцыя невялікіх памераў полацкіх печаў устойлівая да пач. XX ст. Дадаткова заўважым, што дзве полацкія печы XIX – пач. XX ст. яшчэ меншых памераў. Размяшчаліся ацяпляльныя печы блізка да сцен у цэнтры або ў сумежных памяшканнях. Працягласць іх функцыянавання прыкладна да 50 гадоў [1, с. 55].

У Лідскім замку камбінаваная печ сярэдзіны – другой паловы XVI ст. з міскавай кафляй ў ніжнім ярусе і каробка



*1*　　　0　50 см　　　*2*

Мал. 2. Печы Заслаўскага замка (раскопкі і рэканструкцыя Ю.А. Заяца)
*1* – печ службовага памяшкання, канец XVI ст. *2* – печ канца XV-пачатку XVII ст.



*1*　　　*2*

Мал. 3. Рэканстукцыя печаў Полацка і Оршы

*1* – Полацк, печ сярэдзіны – другой паловы XVII ст. (рэканструкцыя і раскопкі Д. У. Дука) памеры 1,1 х 0,92 м, вышыня да 2 м;

*2* – печ першай паловы XVII ст. Куцеінскага Багаяўленскага манастыра ў Оршы (рэканструкцыя і раскопкі В. М. Ляўко)




Мал. 4. Рэканструкцыя печы па модулю кафлі з выявай вінаграднай гронкі



Мал. 5. Печ XVII ст.

вай у верхнім. Пол у плане памерам 1,6 х 1,4 м узведзены з камянёў і бітай цэглы на гліне [2, с. 50].

У Заслаўі на замку выяўлена 6 печаў, на пасадзе – 4. Печ № 1 памерам 1,7 х 2,5 м прызначалася для абагрэву двух сумежных памяшканняў. Печ № 2 памерам 2,1 х 2,5 м, вышынёй 1,9 м узведзена ў к. XVI – пач. XVII ст. Ва ўсходняй частцы замка – печ № 4 памерам 1,5 х 2,3 м, вышынёй 2 м. Датуецца па кафлі 1586–1590 гг. [3, с. 50–57, мал. 30].

У Мінску, у раскопе па вуліцы Камсамольскай № 5, у драўлянай пабудове к. XVII – пач. XVIII ст. выяўлена аснова пад печ памерам 1,4 х 2,2 м, выкладзеная з аднаго пласта цэглы-пальчаткі. Поўныя памеры пабудовы не вызначаны, але печ стаяла на 0,2 м ад адной са сцен вузкім бокам [4, с. 37–38]. Пад час археалагічных раскопак 2002 – 2003 гг. па вуліцы Няміга, на месцы ўзведзенага паркінга, у пабудове XVII ст. знаходзілася печ памерам 0,9 х 1,3 м. Яе контуры дакладна прасочваліся ніжнім радком гзымсавай кафлі з раслінным арнаментам. Печ прызначалася для прыгатавання ежы і выпечкі хлеба. Размяшчалася пасярэдзіне памяшкання [5].

У паселішчы Мір у раскопе 3 на паўднёвы ўсход ад касцёла, у драўлянай пабудове, выяўлена ніжняя частка печкі 2-й паловы XVII ст. памерам 1,1 х 1 м, складзеная з цэглы [6, с. 37–38]. У замку на рэштках падмурка дваровай кухні, пабудаванай у к. XVI – пач. XVII ст., ізноў былі ўзведены ў к. XIX – пач. XX ст. сцены іншай пабудовы з познесярэдневяковай цэглы-пальчаткі, выкарыстанай другасна з нейкіх ранейшых пабудоў. У куце, у 0,6 м ад адной сцяны, у памяшканні плошчай 34,7 кв. м., размяшчалася печ, ад якой застаўся апечак памерам 1,1 х 2,2 м, выкладзены таксама з цэглы-пальчаткі. Вусце печы знаходзілася ў прасценку суседніх пакояў. У суседнім пакоі побач вусця печы знаходзіўся камін. Аця-



Мал. 6 Працэс рэстаўрацыі печы царквы-пахавальні кн. Святаполк-Мірскіх.

пляльныя печ і камін датуюцца па кафлі к. XIX – пач. XX ст. [7, с. 37–38].

Намі праведзена спроба рэканструкцыі дакладных памераў круглай печы са Слоніма, зафіксаванай на фотаздымку 40-х г. XX ст. [8, с. 148, мал. 100, 101]. Аналіз фотаздымка дае важны інфармацыйны матэрыял. Печ знаходзілася блізка да кута памяшкання. Скляпеністая столь сведчыць аб мураваных сценах. Топка печы размяшчаецца вышэй апечка, які значна большага памеру, чым сама печ. Верагодна, што ранейшая печ па плошчы перавышала існуючую. З папярэдняй печы і была выкарыстана кафля, якую згодна выгляду малюнка вінаграднай гронкі можна датаваць XVII ст. Вельмі падобны малюнак кафлі выяўлены пры археалагічных даследаваннях Навагрудка, Міра і Замкавага комплексу “Мір” [9, мал. 88, 9; 10; 11, с. 451, мал. 225, 19]. Цікава, што найбольш супадаюць малюнкі мірскай і слонімскай кафлін. Модуль мірскай кафлі стаў асновай для рэстаўрацыі дыяметра і вышыні слонімскай печы (мал. 4).

Для мэт рэстаўрацыі ў замку прапануем выкарыстаць малюнак печы XVII ст., выяўлены А.А. Трусавым у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі [8, с. 148, мал. 99]. На ім адлюстраваны адзін з відаў дывановай кафлі, якая пачала шырока выкарыстоўвацца з канца XVII ст. (мал. 5). Узнаўленню вонкавага выгляду і модулем у рэканструкцыі памераў печы малюнка дапаможа любы від кафлі, якая выраблялася ў Міры ў адзначаны час.

Абагульняючы агляд рэканструкцый познесярэдневяковых печаў, вызначым некаторыя іх характарыстыкі. Вонкава яны выглядалі двух’яруснымі прамакутнікамі. Памеры печаў залежалі ад іх прызначэння.

Для ацяплення аднаго памяшкання ўзводзіліся невялікія па аб’ёму печы памерамі ў плане ў сярэднім 1 x 1 м. У печах

Гродна, Ліды, Полацка, Заслаўя, Оршы і Мсціслаўя заўважана агульная заканамернасць. На ніжнім ярусе колькасць кафлін па гарызанталі дасягае 5–6 і 6,5. У мсціслаўскіх печах – 7 [2, с. 177, мал. 131; с. 178, мал. 132]. Па вертыкалі найчасцей 3 кафліны і радзей 4. Колькасць кафлін верхняга яруса па гарызанталі меней за першы на 1–2. Вышыня яруса звычайна складае дзве вышыні ніжняга.

Для ацяплення двух сумежных памяшканняў печы ў плане прамакутныя. Адна частка размяшчалася ў адным памяшканні, а другая ў сумежным. Па гарызанталі доўгага боку выкладвалася 7,5–9 кафлін, па вертыкалі – 3. Верхні ярус адпавядаў прапарцыянальным суадносінам печы з боку тарцавой часткі, як гэта назіраецца ў папярэдніх печах.

На жаль, пры рэканструкцыі печаў не вызначаецца выгляд і размяшчэнне топачнага вусця печаў. На сённяшні дзень назапашана дастаткова археалагічнага матэрыялу, які можна паспяхова выкарыстаць.

Такім чынам, вышыня ўсіх ацяпляльных печаў XVI – пач. XVIII ст. знаходзілася ў межах 1,9–2,2 м. Памеры ў плане адпавядалі яе функцыі. Для ацяплення аднаго памяшкання яна набліжана да квадрата, для ацяплення сумежных – форма прамакутніка. Ніжні ярус шырэйшы за верхні на асноўны модуль 1–2 кафлін. Вышыні ніжняга і верхняга ярусаў суадносяцца 1:2. Рэканструкцыя памераў печы ў Слоніме на фотаздымку 40-х г. XX ст. пацвярджае гэтыя модулі і прапорцыі.

Насамрэч, рэканструкцыя печаў, прапанаваная УП “Мінскпраект”, не вытрымлівае ніякай крытыкі і патрабуе найхутчэйшага перагляду.

У заканчэнні звернем увагу на непрафесійны, нават варварскі падыход да рэстаўрацыі печаў на тэрыторыі Замкавага комплексу “Мір”. На печах царквы-пахавальні кн. Святаполк-Мірскіх пачатку XX ст. збілі і паламалі ўсю

кафлю, замест таго каб аднавіць трэць страчанай кафлі, а печы разабралі без дакладнага вызначэння сістэмы кладкі і дымаходаў (мал. 6). На іх месцы былі ўзведзены з сучаснай цэглы муляжы печаў і абкладзены зробленай на заказ кафляй. Выяўлены падчас археалагічнага нагляду 2007 г. на тэрыторыі дваравой кухні замка падмурак печы к. XIX – пач. XX ст. раскідалі. Падлогу дваравой кухні выклалі гранітам, якога там ніколі не існавала, і гранітам іншага колеру контурна выдзелілі месца размяшчэння печы. Так званая "рэстаўрацыя" прыводзіць да змяншэння гістарычнай праўдзівасці помніка ЮНЕСКА. Адказнасць за яе цалкам ускладаецца на навуковага кіраўніка па рэстаўрацыі Д.С. Бубноўскага, які не забяспечыў належны навуковы ўзровень за працамі і прадэманстраваў свой архітэктурны погляд.

**Літаратура:**


1. Здановіч, Н.І. Кафлярства ў Беларусі (па матэрыяле калекцыі полацкай кафлі): метад. дапаможнік / Н.І. Здановіч; рэд. В.М. Мазуро. – Мінск: Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", 2005. – 99 с.
2. Здановіч, Н.І. Беларуская паліваная кераміка XII–XVIII стст. / Н.І. Здановіч, А.А. Трусаў; пад рэд. Г.В. Штыхава. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 182 с.
3. Заяц, Ю.А. Заслаўская кафля / Ю.А. Заяц; пад рэд. Г.В. Штыхава. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 62 с.
4. Археалагічныя даследаванні культурнага пласта на месцы помніка архітэктуры XIX ст. дома № 5 па вул. Камсамольскай у г. Мінску ў 2000 г.: справаздача аб археалагічных раскопках / архіў ІГ НАНБ, справа № 1877 / П.А. Русаў – Мінск, 2001. – 70 с.

5. Аўтар удзячны С.В. Тарасаву за прадстаўлены матэрыял.

6. Краўцэвіч, А.К. Стары Мір / А.К. Краўцэвіч, Г.М. Якшук; нав. рэд. А.А. Трусаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 85 с.

7. Русаў, П.А. Археалагічны нагляд у двары замкавага комплекса “Мір” (на месцы былой кухні), у г. Мір Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці ў 2007 г.: справаздача аб археалагічных раскопках / архіў Русава П.А. – Мінск, 2008. – 40 с.

8. Трусов, О.А. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI–XVII вв. / О.А. Трусов; ред. Г.В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1988. – 159 с.

9. Здановіч, Н.І. Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка / Н.І. Здановіч, А.К. Краўцэвіч, А.А. Трусаў; пад рэд. М.М. Чарняўскага. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – 152 с.

10. Трусаў, Беларуская кафля. Камплект паштовак / Трусаў; рэд. Т. Улевіч. – Мінск: Беларусь, 1995. – 33 с.

11. Археалогія Беларусі. У 4 т. Т. 4. Помнікі XIV–XVIII стст. / В.М. Ляўко, М.Ф. Гурын, Ю.А. Заяц і інш.; пад рэд. В.М. Ляўко і інш. – Мінск: Беларуская навука, 2001. – 597 с.